

## Тэрарызму няма апраўдання

СТАР. 4

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 СНЕЖНЯ 2016 г. СЕРАДА № 246 (28356)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Дзяржава для народа
Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў



## Як стары дом аграсядзібай стаў

■ Далучайцеся!

## ДЗЕНЬ ДОБРЫХ СПРАЎ

*«Падары дзіцяці свята!» — пад гэтым дэвізам заўтра «Звязда» ладзіць у сталічным ГУМе збор падарункаў для выхаванцаў мінскага дзіцячага дома №5. Такім чынам мы далучаемся да рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».*

*Шаноўныя чытачы, у гэты дзень у вас ёсць магчымасць дапамагчы дзеткам, якія засталіся без бацькоўскага клопату, атрымаць прыемны сюрпрыз. Набыўшы ў аддзелах канцылярскіх і дзіцячых тавараў ГУМа невялікі гасцінец, вы можаце пакінуць яго ў адмысловай святочнай скрыні ў дзіцячым аддзеле на 2-м паверсе ўнівермага.*

*Нашы супрацоўнікі будуць дзяжурыць там з 11 да 19 гадзін і дзякаваць за вашу падтрымку і неабыякавасць. Кожны, хто далучыцца да акцыі, атрымае звяздоўскі сувенір, які застанецца вам напамінам пра гэты дзень. А самыя смелыя і актыўныя ўдзельнікі стануць героямі нашага перадсвяточнага рэпартажу на старонках газеты і ў інтэрнэце.*

*Зрабіць добрую справу кожнаму з нас проста. Далучайцеся! Чакаем вас!*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9723 | ▲ |
| Еўра | 2,0484 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0319 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0746 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ПРОСТА — ЖЫЦЬ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінск, снежань 2016-га.

■ З першых вуснаў

## Гарант бяспекі

### Беларуская армія здольная адэкватна супрацьдзейнічаць сучасным выклікам і пагрозам



**Роля Генеральнага штаба як органа кіравання ўзброенымі сіламі ў многіх дзяржавах заўжды была надзвычай важнай. Невыпадкова Маршал Савецкага Саюза Барыс Шапашнікаў у свой час ахрысціў Генштаб «мозгам арміі». І гэта сапраўды так. Менавіта тут плануюцца найважнейшыя вайсковыя аперацыі, каардынуецца дзейнасць усіх воінскіх часцей і падраздзяленняў, забяспечваецца боегатоўнасць узброеных сіл — а значыць, мір і спакой у краіне.**

Генеральны штаб Узброеных Сіл Беларусі быў створаны 15 гадоў таму. Для гісторыі — імгненне. Але за гэты час шмат чаго зроблена. Беларуская армія дынамічна развіваецца: удасканальваецца баявая падрыхтоўка, абнаўляюцца тэхніка і ўзбраенне. Як паказваюць міжнародныя спаборніцтвы, у некаторых відах ваеннага майстэрства беларускім вайскоўцам няма роўных у свеце. А армія адносна невялікай краіны з'яўляецца гарантам бяспекі не толькі для яе жыхароў, але і для насельніцтва Саюзнай дзяржавы.

Якія прыярытэтныя кірункі дзейнасці ў Генеральнага штаба сёння, што ўяўляе сабой абаронны патэнцыял дзяржавы, а таксама ці здольная беларуская армія адэкватна супрацьдзейнічаць сучасным выклікам і магчымым пагрозам нацыянальнай бяспецы, карэспандэнту газеты «Звязда» ў эксклюзіўным інтэрв'ю расказаў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — **першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ**.

СТАР. 4

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## АДУКАЦЫЯ БЕЗ ПАФАСУ І ПАПУЛІЗМУ

**Ала ЛАЗІЦКАЯ, дырэктар сярэдняй школы №2 горада Століна:**



— Кожны раз, калі гартаю «Звязду», найперш шукаю тэмы, якія хвалююць мяне як педагога. Адукацыя як футбол: у ёй разбіраюцца ўсе, пакуль не паспрабуюць забіць гол у вароты. Таму і дылетанцкіх разважанняў у СМІ хапае. Ці пагодзіцеся вы са мною, што публікацыі ў «Звяздзе» на педагагічную тэматыку вылучаюцца вельмі якасным журналісцкім выкананнем? Яны заўсёды актуальныя і своечасовыя, часта палемічныя, заснаваныя на фактычнай інфармацыі і меркаваннях экспертаў. Але надзіва карэктна ў гэтых артыкулах адлюстроўваецца сутыкненне думак і пазіцый.

Натуральна, што яны вельмі часта выклікаюць шырокі рэзананс у педагагічнай супольнасці, абмяркоўваюцца ў настаўніцкіх, выклікаюць актыўную палеміку ў сацыяльных сетках. Рубрыка «Зваротная сувязь» у самой газеце і на яе сайце таксама сведчыць пра гэта. Вострыя артыкулы працягваюць абмяркоўвацца ў каментарыях публікацый у сацыяльных сетках, якія распаўсюджваюцца ў педагагічных суполках і самі па сабе з'яўляюцца інфармацыйным выклікам. Сярод апошніх рэзанансных матэрыялаў — «У грамадстве ці ў чатырох сценах», «Інфармацыйны фаст-фуд», «Пакаленне «Гугл», «Навошта сучаснаму чалавеку крытычнае мысленне?», круглы стол «Настаўнік — у новай сістэме каардынат» і іншыя. Дарэчы, круглы стол і яго відэазапіс на сайце газеты справакавалі вельмі актыўнае абмеркаванне сярод настаўнікаў, так бы мовіць, зачапіў усіх за жывое. Амаль усе матэрыялы трапляюць у самы «яблычак», ангажуюць да дыскусіі, аб'ядноўваюць неабыякавых людзей.

Актуальны погляд, добрая якасная стылістыка, аргументаванасць разважанняў, адсутнасць тэндэнцыёзнай афіцыйнасці, прафесійная зацікаўленасць, грунтоўнае бачанне праблем, абмеркаванне іх без пафасу і папулізму — усё гэта прываблівае мяне як чытача. Плюс аператыўнасць: пра ўсе новаўвядзенні ў нашай сферы я таксама даведваюся найперш са «Звязды».

Дзякуючы публікацыям у газеце мяняецца градус настрою педагагічнай супольнасці, прынамсі той яе часткі, якая чытае «Звязду», з песімістычнага на рэалістычны. І за гэта словы ўдзячнасці яе аўтарскаму калектыву...

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!